Беларусь.info

№85 30/06/2006

*Найдакладнейшае вымярэнне каштоўнасці чалавека — не тое, што ён робіць у час спакою і ўтульнасці, а тое, як ён трымаецца падчас барацьбы і супярэчнасцяў.*

**Марцін Лютэр Кінг**

Грамадская пазапалітычная і пазацэнзурная ініцыятыва. Распаўсюджваецца бясплатна

# Падзеі

**Маладафронтаўца асудзілі за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі.** Жлобінскі суд асудзіў Эдуарда Зелянкова да штрафу ў памеры 930 тысячаў рублёў. Нагадаем, пракуратура патрабавала для 22-гадовага актывіста моладзевага руху год зняволення з адтэрміноўкай на тры гады за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Хлопца затрымалі ў той час, калі ён маляваў графіці з надпісам «Малады Фронт» і сваімі кантактнымі тэлефонамі.

**У Мінску створаная грамадская камісія «Свабода Казуліну!».** У яе склад увайшлі вядомыя беларускія палітыкі, праваабаронцы, грамадскія дзеячы, юрысты і сацыёлагі. Сябры грамадскай камісіі будуць сачыць за ходам судовага працэсу па справе лідэра Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) і экс-кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Казуліна.

**Міністры замежных спраў G-8 гаварылі аб Беларусі.** Удзельнікі сустрэчы міністраў замежных спраў краін "Вялікай васьмёркі" шчыра абмяняліся думкамі, у прыватнасці, у адносінах да сітуацыі ў Беларусі. Абмеркаванне падобных пытанняў нельга назваць непрыемным, бо яно праходзіць за сталом, дзе сабраліся прадстаўнікі, якія падзяляюць агульныя каштоўнасці, дэмакратычныя прынцыпы і вяршэнства закону.

**Швайцарыя ўвяла санкцыі супраць Лукашэнкі і ягонага атачэньня**. Швайцарыя далучылася да санкцый Эўразьвязу ў дачыненьні да беларускіх службовых асоб, вінаватых у фальсыфікацыі прэзыдэнцкіх выбараў і парушэньні правоў чалавека. Тым часам Мін'юст Беларусі выступіў з заявай, у якой патрабуе ад Эўразьвязу скасаваць візавыя абмежаваньні адносна беларускіх чыноўнікаў.

**Літоўскія кампаніі лёгкай прамысловасьці хацелі б болей супрацоўнічаць зь беларускімі калегамі,** аднак зь цяжкасьцю дамаўляюцца пра пашырэньне эканамічных кантактаў. Адна з буйнейшых газэтаў Літвы “Lietuvos žinios” распавядае пра досьвед прадпрымальнікаў, якія кажуць, што ў Беларусі цяжка працаваць “з-за палітычнай напружанасьці і непаразуменьняў”.

# Факты

**У салігорскіх шахцёраў больш як удвая зьнізілся заробкі.** Крызіс на адным з буйнейшых у Беларусі вытворчым аб’яднаньні — салігорскім “Беларуськаліі” — стаў прычынай рэзкага зьніжэньня заробкаў ня толькі шахцёраў, але й працаўнікоў іншых сфэраў. Імпартэры мінэральных угнаеньняў па-ранейшаму адмаўляюцца падпісваць кантракты зь Беларускай калійнай кампаніяй на ўмовах беларускага боку, які заявіў пра істотнае падвышэньне коштаў на калійную соль.

# Абвесткі

**Новы конкурс – "Фота Свабоды"**. "Фота Свабоды" – Ваш погляд на беларускае жыццё. Дасылайце (з кароткім апісаннем – што, дзе, калі) здымкі падзеяў, сітуацыяў, людзей на адрас svaboda@rferl.org з пазнакай "fota Svabody". Падрабязнасці на www.svaboda.org